ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## Самакіраванне як прадмет дыялогу

***Распачата падрыхтоўка да міжнароднай канферэнцыі з удзелам Савета Еўропы***

**25 красавіка адбылася сустрэча старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіла МЯСНІКОВІЧА з дырэктарам Кангрэса мясцовых і рэгіянальных улад Савета Еўропы Жанам-Філіпам БАЗУЛЕМ.**



На сустрэчы былі абмеркаваны пытанні арганізацыі і правядзення ў Мінску міжнароднай канферэнцыі па пытаннях мясцовага самакіравання з удзелам прадстаўнікоў кангрэса.

— Ваш візіт дазволіць узгадніць усе неабходныя працоўныя пытанні — па парадку дня, даце і месцы правядзення канферэнцыі. Гэта будзе пачатак нашай працы ў рамках падрыхтоўкі такога адказнага мерапрыемства са структурамі Савета Еўропы, — адзначыў Міхаіл Мясніковіч. Паводле яго слоў, па гэтай тэматыцы намецілася пазітыўная дынаміка ва ўзаемадзеянні Беларусі з Саветам Еўропы, Кангрэсам мясцовых і рэгіянальных улад. «Гэта абнадзейвае. Мы развіваем на канструктыўны дыялог. Безумоўна, у нас шмат цікавых ідэй і прапаноў», — падкрэсліў ён.

Старшыня Савета Рэспублікі таксама звярнуў увагу на тое, што пытанні мясцовага самакіравання пастаянна знаходзяцца ў полі зроку верхняй палаты беларускага парламента.

## Парламенцкая дыпламатыя

***У Савеце Рэспублікі адбыліся сустрэчы з кіраўнікамі дыпламатычных місій Грузіі і Эстоніі ў нашай краіне***

З Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Грузіі Валерыем Квараццхелія спікер верхняй палаты парламента Міхаіл Мясніковіч абмеркаваў пытанні гандлёва-эканамічнага і міжпарламенцкага супрацоўніцтва, перспектывы рэалізацыі сумесных праектаў.

На думку Міхаіла Мясніковіча, парламентарыі Беларусі і Грузіі маглі б больш эфектыўна супрацоўнічаць перш за ўсё ў рамках груп дружбы. Беларусь таксама зацікаўлена развіваць партнёрства з Грузіяй у сферы адукацыі і навукі.

У сваю чаргу пасол Грузіі адзначыў высокую цікавасць дзелавых колаў Грузіі да супрацоўніцтва з Беларуссю. У ліку перспектыўных напрамкаў узаемадзеяння ён назваў IT-сферу і ахову здароўя.

З Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Эстоніі ў Рэспубліцы Беларусь Мерыке Кокаеў сустрэўся старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рахманаў. На гэтай сустрэчы таксама былі абмеркаваны пытанні гандлёва-эканамічнага і міжпарламенцкага супрацоўніцтва.

У якасці магчымых сфер узаемадзеяння Сяргей Рахманаў назваў IT-тэхналогіі, вытворчасць святлодыёднай, лазернай, рэнтгенаўскай тэхнікі, фармацэўтыку, адукацыю. «Мы гатовыя разглядаць розныя варыянты супрацоўніцтва, у тым ліку і стварэнне сумесных вытворчасцяў, — адзначыў ён. — Напрыклад, разам мы маглі б стварыць нанатэхналагічны цэнтр. Гэта перспектыўны праект, да якога можна было б прыцягнуць і іншых удзельнікаў».

## На свае вочы

***Сенатары праманіторылі фермы Брэстчыны***

**У сярэдзіне красавіка, у рамках выканання даручэння Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, упаўнаважанага прадстаўніка кіраўніка дзяржавы па Брэсцкай вобласці Міхаіла МЯСНІКОВІЧА, членамі Савета Рэспублікі праведзены маніторынг эфектыўнасці малочнатаварных комплексаў Брэсцкай вобласці.**

У склад камісіі, якая ажыццяўляла маніторынг, увайшлі сенатары Ігар Краўчанка, Вольга Леўчанка, Аляксандр Марчанка, Анатоль Шчасны і Аляксандр Шышко.

Члены Савета Рэспублікі наведалі кампаніі: «Кастрычнік-Агра» і «Баравіца» Іванаўскага, «Стытычаўскае» і «Парахонскае» Пінскага, «Роўбіцкае», «Жураўлінае» і «Айчына» Пружанскага раёнаў. Рэканструкцыя і мадэрнізацыя малочнатаварных фермаў (памяшканняў пад утрыманне маладняку) у гэтых гаспадарках у асноўным ажыццяўляецца за кошт уласных сродкаў.

Маніторынг выявіў устойлівы рост па большасці паказчыкаў, якія даследаваліся. Парламентарыі ўпэўніліся, што жывёлагадоўля ў рэгіёне развіваецца дынамічна.

Сенатары адзначылі, што ва ўсіх гаспадарках вядзецца мэтанакіраваная праца па вырошчванні рамонтнага маладняку малочнага напрамку, а гэта ў будучыні дазволіць павялічыць прадукцыйнасць малочнага статка.

Разам з тым у большасці гаспадарак жывёлы не былі адабраныя па прадукцыйнасці і жывой вазе. Заўважылі члены Савета Рэспублікі і недахопы ў некаторых гаспадарках пры загрузцы кармоў, у выніку якіх губляюцца пажыўныя рэчывы ў корме. Яшчэ адна заўвага датычылася павышанай вільготнасці кармавой сумесі, што сведчыць пра парушэнні тэрмінаў нарыхтоўкі кукурузнага сіласу.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

РАБОЧАЯ СУСТРЭЧА

# АБ'ЯДНАЦЬ ІНТАРЭСЫ І АТРЫМАЦЬ ВЫНІКІ

## Мясцовае самакіраванне ў фармаце беларуска-еўрапейскага супрацоўніцтва

**Праблемы мясцовага самакіравання стануць галоўнай тэмай абмеркавання на міжнароднай канферэнцыі з удзелам прадстаўнікоў Кангрэса мясцовых і рэгіянальных улад Савета Еўропы, якая адбудзецца ў Мінску ў пачатку верасня.**



Рабочая сустрэча **старшыні пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Аляксандра ПАПКОВА** і **дырэктара Кангрэса мясцовых і рэгіянальных улад Савета Еўропы Жана-Філіпа БАЗУЛЯ** прайшла ў фармаце перагавораў у Савеце па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу.

Галоўная тэма абмеркавання — актывізацыя ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва праз правядзенне сумесных мерапрыемстваў з удзелам прадстаўнікоў мясцовых органаў улады, грамадскіх арганізацый, беларускага парламента і прадстаўнікоў мясцовых і рэгіянальных улад еўрапейскіх дзяржаў. Гэтым разам міжнародную канферэнцыю ў фармаце круглага стала запланавана правесці ў Мінску. Сярод пытанняў, якія бакі прапанавалі абмеркаваць на маючым адбыцца форуме, — станоўішча Еўрапейскай хартыі, вопыт работы асацыяцый мясцовага самакіравання ў Беларусі і еўрапейскіх краінах, праблемы трансгранічнага супрацоўніцтва, а таксама роля мясцовых органаў улады ў развіцці турызму, пераадоленні наступстваў аварыі на Чарнобыльскай станцыі, вырашэнні дэмаграфічных праблем.

На думку Аляксандра Папкова, сёння важна аб'яднаць інтарэсы Беларусі і рэгіянальных улад Савета Еўропы — у мэтах атрымання канкрэтнага выніку сумеснага супрацоўніцтва. «Наша мерапрыемства павінна мець практычную выніковасць. Трэба будзе разам выпрацаваць дарожную карту для работы розных структур на ўзроўні міністэрстваў, ведамстваў, навуковай супольнасці. Хацелася б, каб вынікам правядзення нашага круглага стала стала сумесная рэзалюцыя аб супрацоўніцтве, якая адпавядала б як нашым інтарэсам, так і інтарэсам нашых заходнееўрапейскіх партнёраў», — падкрэсліў парламентарый.

У сваю чаргу дырэктар Кангрэса мясцовых і рэгіянальных улад Савета Еўропы Жан-Філіп Базуль назваў маючую адбыцца міжнародную канферэнцыю па пытаннях мясцовага самакіравання «пунктам адліку нашага супрацоўніцтва». Ён падкрэсліў, што «Кангрэс і Савет Еўропы гатовы да дыялогу з Беларуссю, тут няма месца прадузятым адносінам, мы павінны вучыцца адзін у аднаго».

Падчас рабочай сустрэчы ў Савеце Рэспублікі была адзначана станоўчая дынаміка развіцця адносін паміж нашай краінай і Саветам Еўропы. Кангрэс мясцовых і рэгіянальных улад праяўляе цікавасць да паэтапнага пашырэння супрацоўніцтва. Сёння гэта аб'яднанне налічвае 318 членаў, якія прадстаўляюць больш за 200 000 адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак 47 дзяржаў — членаў Савета Еўропы. Беларусь бачыць супрацоўніцтва з Кангрэсам мясцовых і рэгіянальных улад як магчымасць не толькі для атрымання інфармацыі і знаёмства з вопытам развіцця мясцовага самакіравання ў краінах — членах Савета Еўропы, але і для правядзення двухбаковых сустрэч з замежнымі калегамі.

Плануецца, што ў найбліжэйшы час будзе створана рабочая група, у якую ўвойдуць прадстаўнікі нашага Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі і Кангрэса мясцовых і рэгіянальных улад Савета Еўропы для вывучэння ўсіх пытанняў па арганізацыі міжнароднай канферэнцыі ў фармаце круглага стала ў Мінску.

**Наталля БІТЭЛЬ.**

# БУДЗЕМ ЖЫЦЬ ДАЛЕЙ

**Тэме павышэння ролі органаў мясцовага самакіравання ў рашэнні актуальных пытанняў сацыяльна-эканамічнага развіцця было прысвечана выязное пасяджэнне Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання, якое адбылося ўчора ў Слаўгарадзе пад кіраўніцтвам старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіла МЯСНІКОВІЧА.**

Сімвалічна, што адбылося яно ў дзень 32-й гадавіны з дня аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Слаўгарадскі раён пацярпеў ад сур'ёзнага радыеактыўнага забруджвання, па сённяшні дзень у зоне рызыкі знаходзіцца 70 населеных пунктаў, дзе пражывае 13,8 тысячы чалавек — крыху менш за палову насельніцтва раёна. Слаўгарад адзіны на Магілёўшчыне райцэнтр, які знаходзіцца ў зоне радыеактыўнага забруджвання ад 5 да 15 кюры на квадратны кіламетр. Але раён, нягледзячы на ўсе цяжкасці, развіваецца і нават здолеў назапасіць карысны вопыт па пераадольванні наступстваў аварыі і садзейнічанні занятасці насельніцтва. Тут адрадзілі традыцыі старадаўняга сыраварэння і нават заснавалі фестываль «Гаспадарчы сыр», які сёлета будзе адзначацца ўжо сёмы раз. Жыхары Слаўгарадчыны актыўна ўцягваюцца ў прадпрымальніцкую дзейнасць, займаюцца рамесніцтвам, вучацца рэалізоўваць праекты міжнароднай тэхнічнай дапамогі.

Дэпутаты наведалі аб'екты, якія сталі знакавымі ў развіцці гэтай дзейнасці, — Слаўгарадскую сярэднюю школу № 1, Лапацічі сельсавет, унікальны музей пад адкрытым небам у аграгарадку Лясная. Вопытам пераадолення наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, адаптацыі насельніцтва да пражывання на забруджаных тэрыторыях, стварэння спрыяльных умоў для вядзення ў такіх асаблівых абставінах бізнесу, а таксама павышэння інвестыцыйнай прывабнасці раёна падзяліліся старшыня Слаўгарадскага райсавета дэпутатаў Святлана Язерская, старшыня Лапаціцкага сельскага Савета дэпутатаў Сцяпан Байцоў і іншыя. Народныя абраннікі змаглі таксама азнаёміцца з работай прыватных прадпрыемстваў, якія паспяхова рэалізуюць у раёне свой бізнес, наведаць прэзентацыі-выстаўкі вырабаў мясцовых майстроў, гісторыка-культурныя славутасці раёна.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

*(Больш падрабязна пра тое, што адбывалася падчас выязнога пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання, чытайце ў наступным нумары «МС».)*